**Дзямешка Л.А., *прафесар***

# ПРЫЧЫНЫ ЗНІЖЭННЯ СТАТУСУ БІБЛІЯТЭКАРА

З улікам інтэграцыі бібліятэчных і інфармацыйных працэсаў узнікае праблема падрыхтоўкі спецыялістаў новай фармацыі: інфармацыйных менеджэраў, бібліятэкараў-інфарматыкаў, рэферэнтаў, тэхнолагаў, лінгвістаў, бібліятэкараў-аператараў і інш.

Падрыхтоўка такіх спецыялістаў патрабуе не толькі наяўнасці электроннай тэхнікі, распрацоўкі новых інфармацыйных тэхналогій, падключэння публічных бібліятэк да рэспубліканскіх праграм АБІС, іх камп'ютэрызацыі, але і новага мыслення бібліятэкараў, творчай ініцыятывы, зацікаўленасці ў сваёй прафесіі. На гэтым шляху ёсць шмат перашкод. Адна з іх - негатыўная прафесійная спадчына, якую атрымалі работнікі бібліятэк.

Гэтая спадчына адмоўна праявілася ў некалькіх узаемазвязаных напрамках.

Знішчэнне беларускай інтэлігенцыі як ворага савецкай улады, нацыянальных кадраў як нацыяналістаў пацягнула за сабою знікненне цэлага пласта культуры народаў.

Толькі ў 1937 г. было знішчана каля 200 пісьменнікаў; у адзін дзень - 29 кастрычніка - расстраляны А.Вольны, П.Галавач, В.Коваль, І.Харык. У Саюзе пісьменнікаў Беларусі напярэдадні Айчыннай вайны засталося 40 чалавек з 240. Кнігі іх былі адлучаны ад бібліятэк і знішчаны. Увогуле бібліятэкі Беларусі былі пазбаўлены твораў 128 пісьменнікаў, а таксама іншай «шкоднай» літаратуры. Гэтаму спрыялі і спецыяльныя інструкцыі па перагляду каталогаў і фондаў бібліятэк, падпісаныя

Н.К.Крупскай, з доўгім пералічэннем тыпаў літаратуры, якую належала знішчыць. Лічылася, што «бібліятэкі найбольш устойлівыя пры перастройванні розных старарэжымных устаноў, і таму іх патрэбна старанна чысціць».

Пачаліся адмаўленне ад культуры, варварства ў адносінах да бібліятэчных фондаў; бібліятэкі сталі ператварацца ў дадаткі ідэалагічных устаноў.

Прафесіяналізм бібліятэкарам стаў не патрэбен, прафесія інтэлектуальная, элітарная паступова стала ўспрымацца як масавая, другасная, матэрыяльна не забяспечаная.

Са знішчэннем ці эміграцыяй інтэлігенцыі ў бібліятэкі прыйшоў у асноўным малапісьменны народ, абслугоўваць якога не складала ніякіх цяжкасцей. Сапраўды, каго ж і як абслугоўвалі бібліятэкары ў навуковых бібліятэках (не будзем ужо прыгадваць публічныя)? Удумаемся ў прадпісанні Н.К.Крупскай: «...навучыць чалавека разбірацца ў кніжцы, як кніжку вывучаць, як рабіць выпіскі, як працаваць з кнігай». І гэта «Чарговыя задачы навуковых бібліятэк» (такую назву меў артыкул).

Дэвальвацыя прафесіяналізму бібліятэкара расла. Часткаю прафесіі бібліятэкара стала ідэя ацэнкі кнігі з пункту гледжання шкоды ці карысці без усялякіх аб'ектыўных крытэрыяў. Літаратура ацэньвалася па аднаму прынцыпу: ці дапамагае твор камуністычнаму выхаванню чытача.

Публічная бібліятэка згубіла сваю аўтаномію культурна-асветніцкага цэнтра, а бібліятэкар - ініцыятыву, прафесійную годнасць. Ён чакаў інструкцый, метадычных указанняў, якія яму пастаўляліся ў вялікай колькасці, бо ўсе сілы бібліятэк - «метадычных цэнтраў» - былі кінуты на кіраўніцтва бібліятэкамі, на распрацоўку розных камандных тэорый (накшталт усеагульнага кіраўніцтва чытаннем).

Рэгулярная чыстка фонду, перавод кніг з адкрытага доступу ў спецсховішчы, недаступныя для чытача, ідэалагічная апрацоўка бібліятэкара («байца ідэалагічнага фронта»), адлучэнне яго ад нацыянальнай культуры і культуры наогул заклалі аснову «савецкай бібліятэчнай справы», а ў выніку знізілі статус бібліятэкара ў грамадстве і грамадскай свядомасці.